# ЮБІЛЕЙНЫЯ ГАДЫ Ў ГІСТОРЫІ СЯРЭДНЯВЕЧНАГА КАСЦЁЛА

**А. К. Шымак**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, г. Мінск, Беларусь,*
helenaszymak@gmail.com

У артыкуле разглядаецца гісторыя фарміравання традыцыі абвяшчэння юбілейных гадоў у касцёле. Адзначаюцца некаторыя тэалагічныя падставы юбілеяў, а таксама асаблівасці святкаванняў у розныя пантыфікаты. Аўтарам звяртаецца увага на тое, як юбілеі ўплывалі на міжнародныя адносіны паміж краінамі Усходняй Еўропы.

*Ключавыя словы:* юбілейны год; касцёл; папа рымскі; міжнародныя адносіны.

# ЮБИЛЕЙНЫЕ ГОДЫ В ИСТОРИИ СРЕДНЕВЕКОВОЙ КАТОЛИЧЕСКОЙ ЦЕРКВИ

**Е. К. Шимак**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, г. Минск, Беларусь,* helenaszymak@gmail.com

В статье рассматривается история формирования традиции объявления юбилейных лет в католической церкви. Отмечаются некоторые богословские основания для юбилеев, а также особенности празднования в разные понтификаты. Автор обращает внимание на то, как юбилеи влияли на международные отношения между странами Восточной Европы.

*Ключевые слова:* юбилейный год; католическая церковь; папа римский; международные отношения.

Традыцыя адзначаць юбілейныя гады ў касцёле мае вельмі глыбокія карані, якія бяруць свой пачатак ў Старым Запавеце. Пяцідзясяты год называўся юбілейным. Ён быў вельмі цесна звязаны з біблейскай традыцыяй шабату (ад габрэйскага слова «скончыць», «перастаць»). Гэта свята адзначалі кожны тыдзень, было абавязковым утрыманне ад працы, пры гэтым меліся глыбокія рэлігійныя матывы. У святле Бібліі кожны шабат – гэта маленькі юбілей. Лічба дзён тыдня вызначае чарговы юбілей. Праз «тыдзень году» адбываецца год шабату – гэта значыць кожныя пяцьдзясят гадоў трэба было адзначаць юбілейны год. Стары Запавет прадугледжваў падчас шабату не толькі паяднанне з Богам, але і супакой паміж людзьмі [5, с. 38, 41–42].

Упершыню юбілейны год быў абвешчаны ў 1300 г. Папа Баніфацый VIII урачыста адкрыў святкаванне юбілею і абвясціў, што за наведванне базылікі святога Пятра і святога Паўла можна атрымаць поўны адпуст. Першы юбілей суправаджаўся значым уздымам колькасці пілігрымаў, якія жадалі наведаць месцы пахаванняў апосталаў. У Латэранскай базіліцы святога Яна захавалася старажытная фрэска Джота, прысвечаная гэтай падзеі.

Першапачаткова планавалася, што наступныя юбілейныя гады будуць адзначацца кожныя сто год, але ўжо папа Клімент VI распарадзіўся, каб яны адбываліся згодна з біблейскай традыцыяй – раз у пяцьдзясят гадоў. Булай Unigenitus Dei Filius юбілей быў прызначаны на 1350 г. Нягледзячы на чуму і разбуральны землятрус, які абрынуўся на Рым у 1349 г., больш за паўтара мільёна пілігрымаў прыбылі ў горад на ўрачыстасці. Папа дамагаўся перамір'я ў вайне паміж Францыяй і Англіяй, каб зрабіць падарожжы пілігрымаў бяспечнымі [4].

8 красавіка 1389 г. папа Урбан VI выдаў булу Salvator noster Unigenitus, згодна з якой юбілейныя ўрачыстасці павінны былі праходзіць кожныя 33 гады (па колькасці гадоў зямнога жыцця Хрыста, але гэта ідэя так і не замацавалася). Такім чынам ўрачыстасці былі перанесеныя і замест 1400 г. яны адбываліся ў 1390 г. Святкаванне юбілейных гадоў адбывалася на фоне ўнутранага крызізу касцёла, звязанага з так званым Авіньёнскім палонам рымскіх пантыфікаў. З 1309 па 1377 гг. рэзідэнцыя папаў знаходзілася ў Авіньёне, што істотна паўплывала і на колькасць пілігрымаў, якія прыязджалі ў Рым.

Папа Марцін V абвясціў юбілейным 1425 г. З гэтага часу з’явілася практыка чаканкі памятнага медаля і адкрыцця Святых дзвярэй у Латэранскай базыліцы святога Яна [3, с. 15]. Мікалай V у папскай буле Immensa et innumerabilia ад 19 студзеня 1449 г. абвясціў наступны Святы год на 1450 г., тым самым устанавіўшы дату юбілейных святкаванняў кожныя 50 гадоў. 19 красавіка 1470 г. папская була Ineffabilis Providentia, у якой выразна згадвалася наведванне базылік святога Пятра, святога Паўла, святога Яна на Латэране і базылікі Маці Божай Снежнай, абвясціла, што, пачынаючы з 1475 г., па загаду папы Паўла II, юбілейныя ўрачыстасці будуць праводзіцца кожныя 25 гадоў. Папа Павел II не дажыў да абвешчанага юбілею і ўжо наступны пантыфік Сікст IV пацвердзіў абвяшчэнне юбілею 1475 г. [11]

Святкаванне 1500-годдзя патрабавала асаблівай увагі, асабліва на мяжы стагоддзяў. 12 красавіка 1498 г. папская була Consueverunt Romani Pontifices прыпыніла ўсе далейшыя індульгенцыі на гэты год і была пацверджана папскай булай Inter multiplices ад 28 сакавіка 1499 г. Папская була Pastores Aeterni Qui ад 20 снежня 1499 г. ўстанавіла, што толькі

пенітэнцыярыі базілікі святога Пятра маюць права адпускаць грахі. Папа Аляксандр VI упершыню адкрыў Святыя дзверы базылікі святога Пятра. Ён хацеў, каб адкрыццё было адзначана магутнай падзеяй, якую ён знайшоў у жэсце адчынення Святых дзвярэй.

Былі прынятыя меры, каб праз гэтыя дзверы праходзілі пілігрымы падчас юбілейных гадоў. Пазней такая практыка была распаўсюджана таксама і на тры іншыя патрыярхальныя базілікі. Адчыняць Святыя дзверы базылікі святога Пятра было прывілеем выключна для папы, а ў трох іншых базіліках – для яго легатаў. Святыя дзверы павінны былі заставацца адчыненымі днём і ноччу і ахоўваліся па чарзе чатырма святарамі.

На першы погляд можа скласціся ўражанне, што святкаванне юбілейнага году датычылася толькі Рыму і яго галоўных базылік. Але гэта не зусім так. Прытрымліваючыся старазапаветнай трацыцыі рымскія пантыфікі імкнуліся таксама да ўсталявання міру і паміж краінамі. Можна заўважыць тэндэнцыю, што ў межах юбілейных гадоў, альбо напярэдадні іх, ажыўляліся дыпламатычныя кантакты з папствам і ва ўсходнеславянскім рэгіёне. Папскія паслы імкнуліся ўсталяваць мір паміж Маскоўскай дзяржавай і Вялікім Княствам Літоўскім. У кастрычніку 1500 г. папа Аляксандр VI накіраваў свайго легата Пятра Ісвальеза да Ягелонаў, каб заключыць перамір'е паміж узначаленымі імі дзяржавамі і іх суседзямі, каб пачаць сумесную барацьбу з асманамі. Перашкодай на гэтым шляху сталі адносіны Вялікага Княства Маскоўскага і Вялікага Княства Літоўскага. Дагавор, падпісаны ў 1494 г. паміж Іванам III і Аляксандрам Ягелончыкам і падмацаваны шлюбным саюзам Аляксандра і Алены Іванаўны, аказаўся ненадзейным. Абодва бакі мелі намер аднавіць ваенныя дзеянні, якія і пачаліся ў 1500 г. [10, s. 35–36].

У 1525 г. Еўропа перажывала вялікія рэлігійныя і палітычныя падзелы, звязаныя з рэфармацыяй. Але папа Клемент VII усё ж абвесціў чарговы юбілейны год. Абвяшчэнне юбілею не адбывалася ў адзін момант. Вялася грунтоўная падрыхтоўка таксама і ў сферы міжнародных адносінаў. У Рыме 30 красавіка 1523 г. была абвешчана ўрачыстая була Monet nos veritas, якая заклікала еўрапейскіх манархаў да заключэння трохгадовага перамір'я паміж варагуючымі бакамі [9, s. 271–274, № 236]. Папа Адрыян VI і Кліммент VII, які змяніў яго, імкнуліся арганізаваць агульнахрысціянскі антыасманскі паход. Не апошнюю ролю ў ім мусіла адыграць Карона Польская. Рымкая курыя імкнулася завязаць на гэтай аснове перамовы і з Масквой. Але такія захады толькі адштурхоўвалі Жыгімонта I Старога ад ідэі антыасманскай лігі. Тэрыторыі Кароны Польскай і Вялікага Княства Літоўскага неаднаразова рабіліся непераадольнымі для папскіх пасольстваў.

Якраз у гэты час з Рыма ў Маскву прыбыў яшчэ адзін папскі пасол Францішак, біскуп Скарэнскі. Ніканаўскі летапіс паведамляе, што разам з паслом вялікага князя прыйшоў з Рыму Міця Малой, перакладчык, а з ім таксама прыбыў да вялікага князя ад папы рымскага Клімента Іван Франчужаў, біскуп [6, с. 311]. Папа выступаў адным з пасрэднікаў ва ўрэгуляванні адносін паміж Масквой і Вільняй. Юбілейны год мог стаць добрай глебай, каб вырашыць усе неспрыяльныя палітычныя абставіны і ўзняць пытанне аб далучэнні Масквы да антытурэцкай барацьбы і царкоўнай уніі. Пасля заключэння перамір'я з Жыгімонтам I Васіль III адпусціў усіх паслоў. З рымскім легатам, які так нічога і не дасягнуў па галоўных для папы пытаннях, былі адпраўлены ў снежні 1526 г. Геранім Трусаў і Цімафей Ладыгін [2, с. 128–129].

У 1550 г. быў абвешчаны Паўлам III і пацверджаны Юліем III чарговы юбілей. Напярэдадні разгортвалася цікавая дыпламатычная гульня. У 1547 г. царом Іванам IV у германскія княствы быў накіраваны нейкі Ганс Шлітэ. Перад ім была пастаўлена задача запрасіць у Маскву спецыялістаў розных прафесій. У 1548 г. на сустрэчы з імператарам Карлам V Шлітэ заявіў аб тым, што Іван IV мае намер працягваць палітыку Васіля III і што ён жадае далучыцца да каталіцкай царквы. У 1550 г. Шлітэ дараваў нейкаму Іягану Штэйнбергу званне «лацінскага і нямецкага канцлера пры цары». З гэтай нагоды была складзена адпаведная дамова, дзе адзін бок дараваў ганаровае званне, а другі браў на сябе абавязацельствы выконваць інтарэсы Расіі. Гэтая дамова грунтавалася на сцвярджэнні Шлітэ, што маскоўскі князь канчаткова вырашыўся прыняць каталіцтва. Штэйнбергу былі прадастаўлены паўнамоцтвы весці перамовы з папам і імператарам і прасіць для Івана IV каралеўскую карону. У верасні 1551 г. Штэйнберга прыняў ужо папа Юлій III [7, с. 344].

Наступны юбілейны год адзначаўся ў 1575 г. Гэта быў першы юбілей пасля Трыдэнцкага Сабору, таму ён быў вельмі падрыхтаваны і перажываўся ў духу паглыблення веры і аднаўлення каталіцкай царквы. Што датычыцца ўсходняга рэгіёну Еўропы, то ён, перш за ўсё, узгадваўся ў Рыме ў сувязі з перыядам безкаралеўя ў Рэчы Паспалітай. Менавіта тады папскія нунцыі сачылі за перадвыбарнай барацьбой, а таксама аналізавалі шансы кандыдатуры Івана IV [1, с. 69–76, №20].

Разважаючы над абставінамі святкавання юбілеяў у каталіцкай сярэднявечнай царкве, можна заўважыць вялікае значэнне біблейскіх старазапаветных традыцый, уплыў кожнага асобнага пантыфікату, а таксама міжнародны характар юбілейных гадоў. Абвяшчэнне юбілею прыносіла не толькі рэлігійныя плёны ў выглядзе шматлікіх пілігрымак, зацвярджэння новых каталіцкіх супольнасцяў, аднаўлення духоўнага

жыцця. Юбілейныя гады сталі добрай нагодай для ўсталявання міру падчас войнаў і наладжвання міжнародных кантактаў.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Вержбовский Ф. Ф.* Викентий Лаурео, Мондовский епископ, папский нунций в Польше, 1574–1578, и его неизданные донесения кардиналу Комскому, статс-секретарю папы Григория XIII, разъясняющие политику Римской курии в течение вышеуказанных лет, по отношению к Польше, Франции, Австрии и России, собранные в Ватиканском архиве. Варшава : Типог. О. Бергера, 1887.

2. *Глушакова Ю. П.* Неопубликованные источники из Ватиканского архива // Вопросы истории. 1974. № 6. С. 128–132.

3. *Дрозд Ю.* Гісторыя Юбілейных гадоў у Каталіцкім Касцёле // Ave Maria. 2025. № 1–2. С.14–15.

4. *Задворный В.* Климент VI // Католическая энциклопедия. URL: http://xn--j1al4b.xn--p1acf/page/2002 (дата обращения: 9.10. 2025)

5. *Крэміс Я.* Заклік да паяднання. Мінск: Про Хрысто, 2007.

6. Патриаршая или Никоновская летопись // Полное собрание русских летописей ; отв. ред. М.Н. Тихомиров. М. : Наука, 1965. Т. 12.

7. *Пирлинг П.* Россия и папский престол. М. : Современные проблемы, 1912.

8. Святое Евангелле (Секцыя па перакладзе літургічных тэкстаў і афіцыйных дакументаў Касцёла Камісіі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў пры Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў Беларусі). Мінск: Про Хрысто, 2012.

9. Acta Tomiciana. Epistole, legationes, responsa, actiones, res gestae... Sigismundi...Primi...per Stanislaum Gorski...collecte et in tomos XXVII digestae : w XVIII t. – Posnaniae, 1853. T. VI : 1522–1523.

10. *Baczkowski K.* Próby włączenia państw jagiellońskich do koalicji antytureckiej przez papieża Aleksandra VI na przełomie XV i XVI wieku // Nasza Przeszłość. 1994. T. 81. S. 56–75.

11. Historia Jubileuszy. URL: https://www.iubilaeum2025.va/pl/giubileo-2025/giubilei-nella-storia.html (дата обращения: 10.10. 2025)